ЗАЦВЯРДЖАЮ
Пратакол метадычнага савета
Дзяржаўнай установы адукацыі
“Гальшанская сярэдняя школа”
ад__________№____________

# План работы
# метадычнага аб’яднання
# класных кіраўнікоў
# на 2024/2025 навучальны год

**Тэма:** удасканаленне формаў і метадаў выхаваўчай работы класнага кіраўніка па рэалізацыі зместу неперарыўнага выхавання дзяцей і моладзі.

**Мэта:**
удасканальванне работы класных кіраўнікоў па фарміраванні ў вучняў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, па падтрымцы навуэнцаў на этапе выбару сферы будучай прафесійнай дзейнасці, па выхаванні культуры бяспекі жыццядзейнасці і здаровага ладу жыцця.

**Задачы:**

-арганізаваць інфармацыйна-метадычную дапамогу класным кіраўнікам, стварыць умовы для бесперарыўнага павышэння іх прафесійнай кампетэнтнасці;

-працягнуць работу па каардынацыі дзейнасці класных кіраўнікоў ва ўдасканальванні форм і метадаў арганізацыі прафарыентацыйнай і выхаваўчай работы з класным калектывам, фарміраванні прававой свядомасці і законапаслухмяных паводзін падрастаючага пакалення;

-садзейнічаць актыўнаму ўкараненню інтэрактыўных форм і метадаў работы з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі па ўмацаванні грамадзянска-патрыятычных ідэалаў і нацыянальна-сямейных каштоўнасцей.

**Пасяджэнне №1 (30.08.2023г.)**

**Тэма:** Асаблівасці арганізацыі сацыяльнай, ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў 2024/2025 навучальным годзе.

**Мэта:** забеспячэнне нарматыўна-метадычнага суправаджэння выхаваўчага працэсу; каардынацыя планавання, арганізацыі і педагагічнага аналізу выхаваўчых мерапрыемстваў класных кіраўнікоў; знаёмства з нарматыўнымі дакументамі і актамі.

**Форма правядзення:** інструктыўна-метадычная нарада.

**Час правядзення:** жнівень

**Пытанні для абмеркавання:**

1.Нарматыўнае прававое забеспячэнне выхаваўчага працэсу ў 2024/2025 навучальным годзе.

Гусева З.Э., намеснік дырэктара

2. Актуальныя накірункі арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2024/2025 навучальным годзе.

Мадэкша В.Ф., кіраўнік МА

3. Рэкамендацыі па рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2024/2025 навучальным годзе.

Каралевіч І.В., класны кіраўнік Х класа

4.Патрабаванні да афармлення сацыяльна-педагагічнай характарыстыкі класа, структуры аналізу выхаваўчай работы ў класе.

Гусева З.Э., намеснік дырэктара

5. Аб ліквідацыі прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць парушэнням заканадаўства аб абароне дзяцей, якія выхоўваюцца ў неблаганадзейных сем’ях.

Балай А.П., педагог сацыяльны

6. Аналіз работы метадычнага аб’яднання класных кіраўнікоў за 2023/2024 навучальны год. Абмеркаванне плана работы на 2024/2025 навучальны год.

Мадэкша В.Ф., кіраўнік МА

**Пасяджэнне №2 (10.11.2023г.)**

**Тэма:** Сістэма работы класнага кіраўніка па прафілактыцы і папярэджанні правапарушэнняў.

**Мэта:** Фарміраванне прававой свядомасці і законапаслухмяных паводзін падрастаючага пакалення.

**Час правядзення:** лістапад

**Форма правядзення:** круглы стол

**Пытанні для абмеркавання:**

1.Узаемадзеянне класнага кіраўніка і бацькоў у арганізацыі прававога выхавання вучняў.

Малышка А.М., класны кіраўнік V класа

2.Формы прафілактыкі дэвіянтных паводзін вучняў.

Балай А.П., сацыяльны педагог

3.Формы, метады, сродкі фарміравання прававой культуры ў падлеткаў у пазаўрочнай дзейнасці.

Маляўка Т.А., класны кіраўнік IX класа

**Практычная частка:**

1.Распрацоўка памятак для класных кіраўнікоў пры ўзнікненні канфліктных сітуацый.

2. Наведванне выхаваўчых мерапрыемстваў па тэме МА.

**Пасяджэнне №3 (22.03.2025г.)**

**Тэма:** Формы і метады работы класнага кіраўніка па прафесійнай арыентацыі навучэнцаў.

**Мэта:** Удасканальванне форм і метадаў арганізацыі прафарыентацыйнай і выхаваўчай работы з класным калектывам.

**Час правядзення:** сакавік

**Форма правядзення:** творчая гасціная

**Пытанні для абмеркавання:**

1.Псіхалагічныя аспекты прафарыентацыйнай работы класнага кіраўніка.

Сарока А.Ф., класны кіраўнік X класа

2.Формы работы з бацькамі і навучэнцамі па фарміраванні прафесійнай арыентацыі вучняў.

Эйдзюкевіч Н.М., класны кіраўнік VI класа

3.Формы і метады выхаваўчай дзейнасці класных кіраўнікоў, накіраваныя на падрыхтоўку вучняў да самастойнага жыцця.

Абмен вопытам, класныя кіраўнікі

**Практычная частка:**

1.Наведванне выхаваўчых мерапрыемстваў у IX і XI класах.

2.Састаўленне памяткі па профарыентацыі.

**Пасяджэнне №4 (30.05.2025г.)**

**Тэма:** Вынікі работы МА класных кіраўнікоў за 2024/2025 навучальны год.

**Мэта**: абагульненне вопыту, падвядзенне вынікаў работы МА класных кіраўнікоў за 2024/2025 навучальны год

**Форма правядзення:** творчая справаздача.

**Час правядзення:** май

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Падвядзенне вынікаў работы метадычнага аб’яднання класных кіраўнікоў за 2024/2025 навучальны год.

Мадэкша В.Ф., кіраўнік МА

2. Перспектывы выхаваўчай работы на 2025/2026 навучальны год.

Мадэкша В.Ф.,Гусева З.Э.

3. Арганізацыя летняга аздараўлення навучэнцаў.

Гусева З.Э.

**Практычная частка:**

Анкетаванне навучэнцаў па аздараўленні летам.